5. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1899 год. – Могилёв, 1900. – 79 с.
6. НГАБ. – Фонд 3209. – Воп. 1. – Спр. 273.
7. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 26.
8. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 54.
9. НГАБ. – Фонд 2555. – Воп. 1. – Спр. 201.
10. *Мяньчэня, С. В.* Установы Магілёўскага павятовага папячыцельства аб народнай цвярозасці (1897–1914 гг.) / С. В. Мяньчэня // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., 25–26 чэрв. 2015 г., г. Магілёў / уклад. А. М. Бацюкоў, І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУХ, 2015. – 539 с.
11. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 18.
12. НГАБ. – Фонд 2555. – Воп. 1. – Спр. 9.
13. НГАБ. – Фонд 2709. – Воп. 1. – Спр. 35.
14. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 4.
15. НГАБ. – Фонд 132. – Воп. 1. – Спр. 1.
16. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – Спр. 2.
17. *Лесков, Н. С.* Еврей в России: несколько замечаний по еврейскому вопросу / Н. С. Лесков // Библиотека «Вехи». Русская религиозно-философская и художественная литература. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vehi.net/asion/leskov.html#2. – Дата доступа: 18.02.2012.
18. Наша Ніва. – 1913. – № 6.

**(Дата подачи: 19.02.2016 г.)**

*У. Р. Рэут*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск
*U. R. Reut*
The Belarus State Economic University, Minsk

**УДК 94(476)+94(470+571) “1818/1844”**

# ПАДРЫХТОЎКА ІНВЕНТАРНАЙ РЭФОРМЫ ПАМЕШЧЫЦКАЙ ВЁСКІ

# THE PREPARATION OF THE INVENTORY REFORM IN THE LANDLORD VILLAGE

*У артыкуле аналізуецца падрыхтоўка расійскім урадам інвентарнай рэформы памешчыцкай вёскі, рэалізацыя якой у выніку процідзеяння кансерватыўнай большасці Дзяржаўнага савета была абмежавана заходнімі губернямі Расійскай імперыі. Даецца ацэнка ўкладу міністраў Я. Ф. Канкрына, П. Д. Кісялёва і Л. А. Пяроўскага ў распрацоўку «Палажэння» 15 красавіка 1844 г. Зроблена выснова аб тым, што ўвядзенне абавязковых інвентароў разглядалася членамі ўрада як прамежкавы этап да ліквідацыі прыгоннага права.*
*Ключавыя словы: інвентарная рэформа; прыгонныя сяляне; «Палажэнне» 15 красавіка 1844 г.; Я. Ф. Канкрын; П. Д. Кісялёў; Л. А. Пяроўскі.*

*The article analyses the preparation of the landlord village inventory reform by the Russian government whose implementation was restricted to the western provinces of the Russian Empire as a result of the opposition by the State Council’s conservative majority. The article assesses Ministers J. Kankrin, P. Kiseliov and L. Perovsky’s contribution to the development of «Statute»*

*of April 15, 1844. The article concludes that the introduction of compulsory inventories in landlord villages was seen by Cabinet ministers as the interim stage to the full liquidation of serfdom.*
*Key words: inventory reform, serfdom; «Statute» of April 15, 1844; J. Kankrin; P. Kiseliov; L. Perovsky*

Да гэтага часу ў гістарыяграфіі сустракаюцца амаль супрацьлеглыя погляды на інвентарную рэформу памешчыцкай вёскі. Ацэнка інвентарнай рэформы мае выключную залежнасць ад дамінуючай у навуковай супольнасці парадыгмы адмены прыгоннага права ў Расійскай імперыі. Калі яго інтэрпрэтуюць як вымушаную меру, абумоўленую пагрозай сялянскіх хваляванняў, то інвентарная рэформа разглядаецца ў якасці апошняй спробы кансервацыі феадальнага ладу [1, с. 11; 2, с. 503]. У выпадку стаўлення да рэформы 1861 г. як да выніку паслядоўных мерапрыемстваў расійскага ўрада па абмежаванні прыгонніцтва інвентарную рэформу тлумачаць намерам Мікалая I ажыццявіць паступовае вызваленне сялянства [3, с. 103; 4, с. 172].

Згодна з апошняй інтэрпрэтацыяй інвентары, якія паставілі аб’ём павіннасцей у залежнасць ад сялянскага зямельнага надзела, з’яўляліся адным з асноўных прататыпаў устаўных грамат [5, с. 52–53; 6, p. 696]. Палярызацыя поглядаў на месца і ролю інвентарнай рэформы ў вырашэнні сялянскага пытання адбываецца нягледзячы на адсутнасць абагульняючых навуковых прац, прысвечаных рэфармаванню памешчыцкай вёскі. Падаецца, што аналіз падрыхтоўкі інвентарнай рэформы, здзейснены на падставе прынцыпаў гістарызму і аб’ектыўнасці, здольны аказаць дабратворнае ўздзеянне на стан распрацоўкі інвентарнай праблематыкі ў гістарыяграфіі.

Захады ўрада Расійскай імперыі па ўвядзенні інвентароў памешчыцкіх маёнткаў мелі працяглую гісторыю. Яшчэ ў пачатку 1818 г. Я. Ф. Канкрын на загад Аляксандра I склаў запіску аб вызваленні сялян з-пад прыгоннай залежнасці. Праект прадугледжваў паступовы выкуп памешчыцкай зямлі прыгоннымі сялянамі. Пачаткам абмежавання памешчыцкай улады павінна было стаць увядзенне інвентароў з вызначэннем мернай сялянскай працы за зямельныя надзелы [7, стб. 543–544]. Расійская даследчыца І. У. Ружыцкая лічыць, што запіска Я. Ф. Канкрына вызначыла магістральны шлях рэарганізацыі адносін паміж памешчыкамі і сялянамі, дзе дзяржаўнай уладзе была адведзена роля пасрэдніка [8, с. 26]. Рэакцыяй Аляксандра I на праект Я. Ф. Канкрына стала з’яўленне ўказа 23 сакавіка 1818 г. аб абмежаванні прыгонных павіннасцей у заходніх губернях днямі, вызначанымі ў інвентарах [9, с. 98]. Дзякуючы гэтаму ўказу адбылося фармальнае прызнанне інвентароў у якасці гаспадарча-распарадчых дакументаў.

З пачаткам праўлення Мікалая I праца па пошуку сродкаў абмежавання прыгоннага права была працягнута ў шматлікіх сакрэтных камітэтах па сялянскай справе. Для Камітэта 6 снежня 1826 г. М. М. Сперанскі склаў праект «Дадатковага закона аб станах» і тлумачальную запіску да яго. Паводле запіскі сутнасць прыгоннага права вызначалася як прымацаванне сялян да зямлі. Далейшае запрыгоньванне асобы, на думку аўтара, было

выклікана скажэннямі прыгоннага права за часы яго існавання. На думку М. М. Спяранскага, неабходна было вярнуцца да «легальнага становішча» – гэта значыць, да абкладання сялян зафіксаванымі ў адмысловых дакументах павіннасцямі за карыстанне зямлёй [4, с. 170].

Вядучую ролю ў Сакрэтным камітэце 1835 г. адыграў Я. Ф. Канкрын. Камітэт вылучыў тры ступені стану прыгонных сялян:

1) стан прыгонных з абмежаваннем працы на ўладальніка трыма днямі на тыдзень на падставе маніфеста 1797 г.;

2) стан сялян, абавязаных «мернай працай», колькасць і вартасць якой падлічваецца на падставе staноўчага закона;

3) стан сялян, якія карыстаюцца правам вольнага пераходу ад землеўласніка да землеўласніка [4, с. 170].

Асноўнай задачай урада было вызначана заканадаўчае рэгуляванне павіннасцей праз увядзенне інвентароў для пераводу прыгонных з першай на другую ступень.

Сакрэтны камітэт 1835 г. даручыў П. Д. Кісялёву сабраць звесткі пра асаблівасці паменага кіравання ў заходніх губернях, дзе існавалі гаспадарчыя інвентары маенткаў [10, с. 16]. У 1836–1837 гг. П. Д. Кісялёў неаднаразова раіўся з М. М. Спяранскім, а таксама звяртаўся да расійскіх паслоў у Вене і Берліне за звесткамі аб парадку вызвалення сялян у Аўстрыі і Прусіі. Адзначым, што ў Аўстрыі ўрбарыяльная, або інвентарная, рэформа Марыі-Тэрызіі распачала серыю мерапрыемстваў па паступоваму скасаванню прыгоннага права. У Прусіі пасля асабістага вызвалення прыгонных права выкупіць зямлю ў памешчыкаў набылі толькі гаспадары, якія былі ўнесены ў аналагічныя інвентарам грундбухі, або кадастравыя кнігі маёнткаў [11, с. 26].

Сакрэтны камітэт 1839–1842 гг. быў створаны Мікалаем І, каб вырашыць два пытанні:

1) як змяніць умовы вызвалення сялян памешчыкамі (у параўнанні з указам аб вольных хлебаробах. – *У. Р.*);

2) як абмежаваць уладу памешчыкаў праз увядзенне інвентароў [8, с. 27; 12, арк. 8 зв.].

Галоўная ўвага надавалася праекту П. Д. Кісялева аб асабістым вызваленні сялян, якія за карыстанне памешчыцкай зямлёй выконваюць павіннасці згодна з табелем, «адпаведна таму, як у заходніх губернях складаюцца інвентары, а ў ост-зейскіх – вакенбухі» [13, с. 613]. Аднак ужо падчас першых абмеркаванняў праект П. Д. Кісялева быў зменены да непазнавальнасці. Выразы аб вызваленні сялян зніклі са зместу дакумента, а заключэнне дамоў з «абавязанымі сялянамі» пакідалася на добрую волю памешчыка [14, с. 106, 109].

21 лютага 1841 г. Камітэт заходніх губерняў прызнаў неабходным стварыць спецыяльныя губернскія камісіі пад назвай «Камітэтаў для разгляду і складання інвентароў памешчыцкіх маёнткаў». Абгрунтоўваючы неабход-

насць інвентарнай рэформы, члены Камітэта заходніх губерняў неаднаразова выкарыстоўвалі тэзіс пра неабходнасць умацавання «рускага пачатку» ў заходніх губернях, дэманстратыўна баронячы інтарэсы прыгонных перад памешчыкамі польскага паходжання [15, с. 66].

30 сакавіка 1842 г. адбылося доўгачаканае пасяджэнне Дзяржаўнага савета, прысвечанае праекту П. Д. Кісялева. Французскі пасол К. Пер'е паведамляў свайму ўраду аб чутках, якія з'явіліся сярод сталічнага дваранства. Сутнасць іх зводзілася да таго, што вызваленне сялян быццам бы ўжо вырашана і праз некалькі дзен з'явяцца неабходныя ўказы. Паводле рэляцыі пасла, у свецкіх салонах людзі сустракаліся з перапалоханымі тварамі і размаўлялі толькі «аб разарэнні і рабаўніцтве» [16, с. 577].

Аднак у Дзяржаўным савеце буйныя землеўладальнікі ўтваралі моцную групоўку, якая ўпарта бараніла памешчыцкія інтарэсы. Нечаканая прапанова маскоўскага ваеннага губернатара Д. В. Галіцына пра абмежаванне памешчыцкай улады інвентарамі сустрэла рашучы пратэст кансерватыўнай большасці Дзяржаўнага савета [10, с. 258; 14, с. 109]. Мікалай I адразу адмежаваўся ад ініцыятывы маскоўскага губернатара. У сваім выступленні імператар пацвердзіў непарушнасць прыгоннага права і выказаў толькі ўласную незадаволенасць празмернай публічнасцю вышэйшых чыноўнікаў, якія заўчасна распаўсюджвалі звесткі, якія з'яўляліся дзяржаўнай тайнай.

Указ ад 2 красавіка 1842 г. надаваў памешчыкам права заключаць дамовы з прыгоннымі сялянамі аб перадачы ім у карыстанне надзельнай зямлі за выкананне дакладна вызначаных павіннасцей. М. М. Дружынін заўважаў, што «ў тэксце ўказа не было ніякага намёка на першапачатковыя ідэі – інвентарызацыю памешчыцкіх маёнткаў і прадстаўленне сялянам асабістай свабоды» [13, с. 626]. Аднак галоўным недахопам указа аб абавязаных сялянах з'яўляліся не фармуліроўкі артыкулаў дакумента, а яго факультатыўны статус.

Пасля адмовы ад заканадаўчага рэгулявання «мернай працы» сялян на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі праца над праектам па ўвядзенні абавязковых інвентароў памешчыцкіх маёнткаў працягнулася ў Камітэце заходніх губерняў [8, с. 98]. Вядучую ролю ў распрацоўцы праекта інвентарнай рэформы памешчыцкай вескі пачаў выконваць новапрызначаны міністр унутраных спраў Л. А. Пяроўскі, які да гэтага здзейсніў шэраг дастаткова паспяховых пераўтварэнняў ва ўдзельнай весцы.

Вядомы публіцыст В. Р. Бялінскі вызначаў Л. А. Пяроўскага чалавекам, які доўгі час не мог вызначыць сваё ўласнае стаўленне да прыгоннага права, будучы «ў душы супраць вызвалення рабоў, а па свайму хісткаму становішчу абвясціўшы сябе за неабходнасць вызвалення» [17, с. 439]. Аднак памешчыцкія колы ставілі Л. П. Пяроўскага ў адзін шэраг з П. Д. Кісялёвым. Па Маскве нават хадзіла карыкатура з подпісам: «Ідзе цень Пугачова, абапіраючыся адной рукой на плячо Пяроўскага, а другой – на плячо Кісялёва» [18, с. 230]

У другой палове 1842 г. віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Міркавіч і кіеўскі генерал-губернатар Д. Г. Бібікаў даслалі ў Міністэрства ўнутраных спраў заўвагі па правядзенні інвентарнай рэформы. Прапановы Ф. Я. Міркавіча зводзіліся да неабходнасці паасобнай праверкі і ўдакладнення існуючых гаспадарчых інвентароў [19, арк. 57]. Д. Г. Бібікаў лічыў неабходным распрацаваць адзіныя інвентарныя правілы. Заўваг віцебскага генерал-губернатара П. М. Дзякава не дачакаліся. Ён меў рэпутацыю марнатраўца і быў больш схільны да эксцэнтрычных учынкаў, чым да выканання паўсядзённых службовых абавязкаў [20, с. 217].

У лютым 1843 г. Л. А. Пяроўскі падрыхтаваў праект «Палажэння аб аднастайным і агульным увядзенні інвентароў у памешчыцкіх маёнтках», якое прызначалася для ўсіх заходніх губернях. Міністр унутраных спраў прапанаваў заканадаўча зацвердзіць прававыя функцыі, якія гістарычна замацаваліся за інвентарамі ў заходніх губернях [19, арк. 38]. Л. А. Пяроўскі лічыў, што неабходна распрацаваць агульную форму для інвентароў, каб надаць ім большую аднастайнасць. Згодна з праектам сяляне падзяляліся на цяглавых, паўцяглавых, агароднікаў і бабылёў. Павіннасці былі падзелены на галоўныя (за карыстанне зямельным надзелам) і дадатковыя (за карыстанне сервітутамі і папячыцельства з боку памешчыка) [17, арк. 47].

Я. Ф. Канкрын паставіўся да праекта Л. А. Пяроўскага насцярожана і рэкамендаваў не ўключаць у правілы складання інвентароў максімальныя матэрыяльныя і лічбавыя нормы павіннасцей і ўрокаў на працу. Міністр фінансаў прадбачыў, што калі патрабаваць ад памешчыкаў увядзення новых інвентароў па вызначанаму ўзору, то яны паспрабуюць замацаваць як мага большыя павіннасці, дазволеныя законам [19, арк. 67–68]. Я. Ф. Канкрын рэкамендаваў абмежавацца рэвізіяй існуючых інвентароў. Тэрыторыю правядзення інвентарнай рэформы прапанавалася абмежаваць дзвюма губернямі: Віленскай і Ковенскай або Віцебскай і Магілёўскай [19, арк. 68].

Рэакцыя П. Д. Кісялёва была яшчэ больш крытычнай. На яго думку, патрабаванне Л. А. Пяроўскага ўводзіць інвентары па адзінаму ўзору было здольна выклікаць пераварот у памешчыцкай гаспадарцы заходніх губерняў. Міністр дзяржаўных маёмасцей выступаў за тое, каб зацвердзіць сабраныя ад памешчыкаў інвентары ў тым выглядзе, як ёсць. Ён папярэджваў, што калі будзе патрабавацца ўніфікацыя інвентароў і вымярэнне сялянскіх надзелаў, то «справу можна не скончыць» [19, арк. 76]. Падаецца, што пазіцыя П. Д. Кісялёва была абумоўлена яго стаўленнем да інвентарнай рэформы як да своеасаблівай прыступкі, якая б дазволіла палегчыць будучае вызваленне прыгонных.

У сваю чаргу Л. А. Пяроўскі ставіўся да ўвядзення інвентароў як да самастойнага мерапрыемства, закліканага палепшыць умовы жыцця прыгонных, а таксама ўзняць плацежаздольнасць памешчыцкай вескі. Сярод прычын увядзення інвентарнай сістэмы міністр унутраных спраў рабіў

акцэнт на «вяртанне даверу маёнткам у крэдытна-эканамічных адносінах і ўзмацненне народнага дабрабыту» [21, арк. 8]. Для Л. А. Пяроўскага галоўным было атрымаць адчувальныя гаспадарчыя вынікі. Вызваленне сялян з'яўлялася для яго справай аддаленай перспектывы.

«Палажэнне» 15 красавіка 1844 г., прынятае Камітэтам заходніх губерняў і зацверджанае Мікалаем I, можна лічыць кампрамісным варыянтам правядзення інвентарнай рэформы. Узровень абкладання сялян павіннасцямі павінен быў вызначацца плошчай і якасцю зямельных надзелаў, а таксама іншых выгод, прызначаных для ўладкавання гаспадаркі [21, арк. 5]. Гранічны памер пазямельных павіннасцей – прыгону і згонаў (гвалтаў) – вызначаўся 1/3 валавога даходу сялянскай гаспадаркі. Дадатковыя павіннасці, да якіх адносілі будаўнічыя дні, фурманковую павіннасць і жаночыя паслугі (выраб пражы, палатна і сукна), прызначаліся ў адпаведнасці з колькасцю і якасцю пашы, наяўнасцю лясоў і ўзроўнем папячыцельства памешчыка [21, арк. 6–7].

2 мая 1844 г. быў выдадзены цыркуляр Л. А. Пяроўскага аб адкрыцці інвентарных камітэтаў у дзевяці заходніх губернях Расійскай імперыі. У прэамбуле дакумента інвентарная рэформа абгрунтоўвалася спасылкай на колішні ўказ Аляксандра I ад 23 сакавіка 1818 г., які абмяжоўваў паншчыну днямі, вызначанымі ў інвентарах [22, арк. 1]. Цыркуляр утрымліваў надзвычай размытую фармулёўку асноўнай задачы працы камітэтаў: «… каб не ўваходзячы ў меркаванні ўласна аб форме інвентароў… дапускалі па магчымасці ў тым выглядзе, у якім будуць прадстаўлены… але калі гэта па якіх-небудзь прычынах прызнана будзе немагчымым, то папраўлялі і дапаўнялі інвентары» [21, арк. 2; 22, арк. 4]. Відавочна, што сінтэз супрацьлеглых пачаткаў падчас распрацоўкі інвентарнай рэформы меў сур'ёзныя адмоўныя бакі. Патрабаванне зацвярджаць інвентары, «не ўваходзячы ў меркаванне», выклікала мноства непаразуменняў. Усе далейшыя пралікі і памылкі ў працы інвентарных камітэтаў іх члены тлумачылі тым, што яны літаральна інтэрпрэтавалі распараджэнне міністра ўнутраных спраў.

Такім чынам, праекты па ўвядзенні абавязковых інвентароў памешчыцкіх маёнткаў як пераходнага этапу да вызвалення сялян узніклі ў апошнія гады праўлення Аляксандра I. У 1830-х – пачатку 1840-х гг. правядзенне інвентарнай рэформы было артыкулявана прадстаўнікамі ўрада ў якасці альтэрнатывы ўказу аб вольных хлебаробах. Рэгламентацыя сялянскіх павіннасцей з дапамогай інвентароў дазваляла адкласці вырашэнне пытання аб вызваленні сялян з зямлёй або без яе, якое было сапраўдным каменем перапоны, што спыняла ўсе дыскусіі пра неабходнасць скасавання прыгонніцтва.

Праект інвентарнай рэформы, прапанаваны П. Д. Кісялёвым Сакрэтнаму камітэту 1839–1842 гг., прадугледжваў увядзенне абавязковых інвентароў ва ўсіх губернях Расійскай імперыі. Меркаванні П. Д. Кісялёва не сустрэлі падтрымкі членаў камітэта. Канчатковае паражэнне

праект рэформы пацярпеў у Дзяржаўным савеце, дзе заключэнне дамоў паміж памешчыкамі і сялянамі страціла абавязковасць і набыло пажаданы характар. Вынікам шматгадовай падрыхтоўкі агульнадзяржаўнай інвентарнай рэформы стаў маладзейсны ўказ 2 красавіка 1842 г. аб абавязаных сялянах.

Інвентарная рэформа ў заходніх губернях пачалася ў абыход Дзяржаўнага савета. Заканадаўча яна была афармлена рэзалюцыяй Мікалая І на журнале Камітэта заходніх губерняў і адпаведнымі распараджэннямі міністра ўнутраных спраў. Існаванне практыкі складання гаспадарчых інвентароў на землях Беларусі, Літвы і Правабяржэнай Украіны дазваляла тлумачыць інвентарную рэформу не замахам на памешчыкія правы, а юрыдычным замацаваннем распаўсюджанага прававога звычаю. Вызначэнне дакладных сялянскіх павіннасцей на карысць уладальніка не было спецыфічнай формай вырашэння сялянскага пытання ў Расійскай іперыі, а зыходзіла з вопыту паступовага скасавання прыгоннага права ў суседніх еўрапейскіх краінах, дзе ў памешчыцкіх маёнтках пад рознымі назвамі (вакенбухі, грундбухі, урбарыі) уладамі зацвярджаліся дакументы, аналагічныя інвентарам.

Складаны шлях рэфармавання, абраны кіраўніцтвам Міністэрства ўнутраных спраў, прадвызначыў замаруджаныя тэмпы ўвядзення абавязковых інвентароў. Разам з тым станоўчым бокам рэформы было патрабаванне пераходу да пазямельнага спагнання сялянскіх павіннасцей і скасаванне разнастайных дадатковых падушных адпрацовак і збораў. Дзяржава імкнулася паставіць існаванне прыгоннай працы ў выключную сувязь з карыстаннем памешчыцкай зямлёй. Асабістая залежнасць сялян набывала ўсё большую ўмоўнасць, выхад з-пад якой больш не разглядаўся як парушэнне фундаментальнага права прыватнай уласнасці. Грамадская свядомасць рыхтавалася да думкі пра непазбежнасць ліквідацыі прыгоннага права.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Короткевич, А. Т.* Отмена крепостного права в Витебской губернии: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / А. Т. Короткевич; Моск. гос. ист.-архив. ин-т. – М., 1954. – 17 с.

2. *Семевский, В. И.* Крестьянский вопрос в России в XVIII и первой половине XIX в.: в 2 т. / В. И. Семевский – СПб.: Обществен. польза, 1888. – Т. 2. – 516 с.

3. *Ружицкая, И. В.* Е. Ф. Канкрин и крестьянский вопрос в России / И. В. Ружицкая // Экономическая история. Обозрение / под ред. Л. И. Бородкина. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та, 2001. – Вып. 6. – С. 102–104.

4. *Ружицкая, И. В.* Инвентаризация крестьянских повинностей при Николае I (1825–1855): планы и реальность / И. В. Ружицкая // Экономическая история. Обозрение (Труды исторического факультета МГУ: Вып. 31) / под ред. Л. И. Бородкина. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та, 2005. – Вып. 10. – С. 170–172.

5. *Вормс, А. Э.* Положения 19 февраля / А. Э. Вормс // Великая реформа: русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем: в 6 т. / Ист. ком. уч. отд. Общ. распр. тех. знаний; под ред. А. К. Дживилегова [и др.]. – М.: Т-во И. Д. Сытина, 1911. – Т. 6. – С. 1–53.

6. *Moon, D.* The inventory reform and peasant unrest in right-bank Ukraine in 1847–48 / D. Moon // Slavonic and East European review. – 2001. – № 79(4). – P. 653–697.

7. Записка об освобождении крестьян в России от крепостной зависимости, составленная в 1818 году, по повелению Александра Павловича // Русский архив. – 1865. – Вып. 2. – Стб. 542–552.

8. *Ружицкая, И. В.* «Постепенное уничтожение рабства в России»: деятельность правительства Николая I по регламентации отношений между помещиками и их крепостными / И. В. Ружицкая // Вестн. Рос. ун-та дружбы народов. Сер. История России. – 2007. – № 1(7). – С. 26–36.

9. *Василенко, Н. П.* Крестьянский вопрос в Юго-Западном и Северо-Западном крае / Н. П. Василенко // Великая реформа: русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем: в 6 т. / Ист. ком. уч. отд. Общ. распр. тех. знаний; под ред. А. К. Дживилегова [и др.]. – М.: Т-во И. Д. Сытина, 1911. – Т. 4. – С. 94–109.

10. *Заблоцкий-Десятовский, А. П.* Граф П. Д. Киселёв и его время. Материалы для истории императоров Александра I, Николая I и Александра II: в 2 т. / А. П. Заблоцкий-Десятовский. – СПб.: Тип. Стасюлевича, 1882. – Т. 2. – 355 с.

11. *Персидская, Н. Ю.* Отмена крепостного права в России и Германии (сравнительная характеристика) / Н. Ю. Персидская // Социально-политические науки. – 2011. – № 11. – С. 25–28.

12. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Фонд 982. – Оп. 1. – Д. 48. Краткий исторический обзор крепостного состояния, 1856 г.

13. *Дружинин, Н. М.* Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева: в 2 т. / Н. М. Дружинин. – М.–Л.: Изд. Акад. наук СССР и 2-я тип. изд-ва Акад наук СССР в М., 1946–1958. – Т. 1: Предпосылки и сущность реформы. – 1946. – 635 с.

14. *Корф, М. А.* Император Николай I в совещательных собраниях / М. А. Корф // Сборник императорского Русского исторического общества. – 1896. – Т. 98. – С. 101–286.

15. *Неупокоев, В. И.* Позиция П. Д. Киселева в вопросе создания майоратов в западных губерниях / В. И. Неупокоев // Из истории экономической и общественной жизни России: сб. ст. к 90-летию акад. Н. М. Дружинина / Акад. наук СССР, Ин-т истории; редкол.: Л. В. Черепнин (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1976. – С. 61–71.

16. *Тарле, Е. В.* Император Николай I и крестьянский вопрос в России: по неизданным донесениям французских дипломатов 1842–1847 гг. / Е. В. Тарле // Сочинения: в 12 т. – М.: Изд. АН СССР, 1957–1962. – Т. 4. – 1958. – С. 569–587.

17. *Белинский, В. Г.* Письмо В. Г. Белинского к П. В. Анненкову 1–10 декабря 1847 г. / В. Г. Белинский // Полное собрание сочинений: в 13 т. – М.: Изд. АН СССР, 1953–1959. – Т. 12. – 1956. – С. 435–442.

18. *Нефедов, С. А.* Демографически-структурный анализ социально-экономической истории России. Конец XV – начало XXI в. / С. А. Нефедов. – Екатеринбург: Изд-во УГГУ, 2005. – 543 с.

19. РГИА. – Фонд 1266. – Оп. 1. – Д. 34. Журнал Комитета Западных губерний, 1844 г.

20. «Россия под надзором»: отчеты III отделения 1827–1869 [сб. док.] / сост.: М. В. Сидорова, Е. И. Щербакова; редкол.: А. Л. Налепин (гл. ред) [и др.]. – М.: Рос. фонд культуры, Рос. архив, 2006. – 706 с.

21. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБ). – Фонд 142. – Воп. 1. – Спр. 1777. Журнал заседаний инвентарного комитета, 1844 г.

22. НГАБ. – Фонд 2635. – Воп. 1. – Спр. 1. Об открытии губернского комитета об инвентарях помещичьих имений, 1844 г.

**(Дата подачи: 17.02.2016 г.)**